УДК 327:930(4)«1938/…»

**Л. Ч. Дрожжа**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# МЮНХЕНСКАЕ ПАГАДНЕННЕ 1938 Г.: УРОКІ МІНУЛАГА (ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ)

Прадметам даследавання з'яўляецца Мюнхенскае пагадненне 30 верасня 1938 г., якое характарызуе міжнародныя адносіны перадваеннага перыяду ў адлюстраванні сучаснай заходнееўрапейскай, польскай і расійскай гістарыяграфіі з мэтай высвятлення ролі гэтай падзеі ў гісторыі Еўропы і свету. Мюнхенскае пагадненне лічыцца класічным прыкладам праявы палітыкі «замірэння» агрэсара, якая ў канцы 1930-х гг. прывяла да росту агрэсіўнасці Германіі і стала адной з перадумоў пачатку Другой сусветнай вайны.

**Ключавыя словы:** міжнародныя адносіны, Мюнхенскае пагадненне 30 верасня 1938 г., Другая сусветная вайна, гістарыяграфія.

**L. Ch. Drojja**
Belarusian State Technological University

# MUNICH AGREEMENT 1938: LESSONS OF THE PAST (HISTORIOGRAPHY OF PROBLEM)

The article of research is the Munich agreement of September, 30, 1938, which characterizes the international relations of period before World War II, in the reflection of modern Western-European, Polish and Russian historiography with the purpose of finding out of role of this event in history of Europe and world. The Munich agreement is considered the classic example of display the policy of appeasment for aggressor, which at the end of 1930th y. resulted in growth of aggressiveness of Germany and became one of pre-conditions of the beginning of World War II.

**Key words:** international relations, World War II, Munich agreement of September, 30, 1938, historiography.

**Уводзіны.** Гістарычныя падзеі, звязаныя з перадумовамі пачатку Другой сусветнай вайны, у тым ліку Мюнхенскае пагаднне 1938 г., у апошні час сталі прадметам дыскусій не толькі сярод гісторыкаў, але і грамадскіх дзеячаў. Мэта праведзенага даследавання – аналіз сучаснай гістарыяграфіі ў высвятленні ролі Мюнхенскага пагаднення ў гісторыі перадваеннай Еўропы і свету. Для дасягнення мэты вырашаліся наступныя задачы: 1) разглядзець трактоўку Мюнхенскага пагаднення ў заходнееўрапейскай, польскай і расійскай гістарыяграфіі; 2) раскрыць адметныя і агульныя рысы ў ацэнцы замежнымі і расійскімі гісторыкамі вытокаў і наступстваў Мюнхенскага пагаднення.

**Асноўная частка.** Мюнхенскае пагадненне 1938 г., правамерна названае савецкімі гісторыкамі «змовай», – адна са знакавых падзей, якая папярэднічала Другой сусветнай вайне. Мюнхенская змова, пагадненне аб далучэнні памежных зямель Чэхаславакіі, населеных пераважна судэцкімі немцамі да нацысцкай Германіі, было падпісана 30 верасня 1938 г. на канферэнцыі ў Мюнхене прадстаўнікамі Вялікабрытаніі (Н. Чэмберлен), Францыі (Э. Даладзье), Германіі (А. Гітлер) і Італіі (Б. Мусаліні). Дамова з'явілася вынікам агрэсіўнай палітыкі Германіі і Гітлера, які абвясціў рэвізію Версальскага мірнага дагавора з мэтай аднаўлення германскага рэйха, з аднаго боку, і англа-французскай палітыкі «*appeasement*» – «замірэння» агрэсара, з другога [1].

Цікава тое, што Чэхаславакія не прымала ўдзелу ні ў абмеркаванні Мюнхенскага пагаднення, ні ў яго падпісанні. Да асноўнага тэксту дагавора дадаліся адно дадатковае пагадненне і тры дадатковыя дэкларацыі, якія былі паслядоўна падпісаныя на працягу ночы з 29 на 30 верасня 1938 г. прадстаўнікамі краін-удзельніц асобна [2, с. 237–239]. У сувязі з гэтым тэрмін «Мюнхенскае пагадненне» ў навуковай літаратуры часта прыводзіцца ў множным ліку – «Мюнхенскія пагадненні». Абодва тэрміны маюць адзін і той жа сэнс і з'яўляюцца раўнапраўнымі.

У апошня гады ў канцы верасня – пачатку кастрычніка публікуюцца, прымеркаваныя да гадавіны падпісання Мюнхенскага пагаднення, меркаванні палітыкаў, навукоўцаў па такіх пытаннях: ці стаў Мюнхенскі дагавор «кропкай невяртання» ў развязванні Другой сусветнай вайны; ці вінаватыя Вялікабрытанія і Францыя, якія праводзілі палітыку «замірэння» агрэсара, у гэтай трагедыі; якія актуальныя ўрокі «Мюнхенскай змовы» вывучаюцца на сучасным этапе і інш. [3].

Вынікі дагавора далі кіраўніцтву Трэцяга Рэйха сур'ёзныя падставы спадзявацца на тое,

што Англія і Францыя і ў будучыні не будуць рэагаваць на агрэсіўныя дзеянні Германіі. Гэтае пагадненне, складзенае без удзелу Чэхаславакіі, фактычна прывяло да яе падзелу паміж Германіяй, Венгрыяй і Польшчай. Мюнхенскае пагадненне відавочным чынам зашчамляла інтарэсы дзяржавы, якая не ўдзельнічала ў вырашэнні свайго ўласнага лёсу.

У *англійскай гістарыяграфіі* з дня заключэння Мюнхенскага пагаднення яго ацэнка гісторыкамі змянялася некалькі разоў. Пагадненне выклікала ў свой час рэзкае размежаванне ў англійскім палітычным асяроддзі. Пачатак вайны ў верасні 1939 г. пераканаўча пацвердзіў, што знешнепалітычны курс Англіі пацярпеў крах. Пагадненне ў Мюнхене было прызнана «памылкай». Аднак за гэтым не было сур'ёзнага аналізу прычын гэтай «памылкі». Брытанскія гісторыкі імкнуліся прадставіць Мюнхенскае пагадненне справай рук аднаго Н. Чэмберлена і невялікай групы яго дарадцаў. Прафесар Лонданскага ўніверсітэта, аўтар двухтомніка «Эканамічная блакада», які ўвайшоў у афіцыйную англійскую «Гісторыю Другой сусветнай вайны», і яго калега У. Медлікот у сваіх працах абвінавачвалі Чэмберлена за «адсутнасць ініцыятывы, прадбачлівасці і хуткай рэакцыі». Канцэпцыя Мюнхенскай змовы як вынік уласнай памылкі Чэмберлена апынулася жывучай, у розных варыянтах яна паўтаралася ў англійскай навуковай літаратуры доўгі час [4].

Іншы англійскі гісторык Л. Нэмір у кнізе «Дыпламатычная прэлюдыя» лічыць, што Н. Чэмберлен быў дылетантам у дыпламатыі, не меў ведаў і вопыту, неабходных для кіраўніцтва знешняй палітыкай Англіі ў выключна складанай абстаноўцы тых гадоў; ён проста не разумеў да канца таго, што адбываецца, не аддаваў сабе справаздачы ў наступствах сваіх крокаў [2, с. 190–195]. У сучаснай англійскай гістарычнай навуцы зацвердзілася меркаванне аб непазбежнасці Мюнхенскага пагаднення з мэтай захавання міру ў передваеннай Еўропе.

Падыходы вядучых *французскіх гісторыкаў* да палітыкі Трэцяй рэспублікі ў перыяд Мюнхена ў некаторай ступені разыходзяцца. Аднак французскія даследчыкі, напрыклад Ж.-Б. Дзюразэль, Ф. Бедарыда і іншыя, у той ці іншай меры схільныя ўскладаць адказнасць за заключэнне Мюнхенскіх пагадненняў на Англію, прызнаючы факт уплыву ў передваенны перыяд на французаў брытанскіх дыпламатычных колаў. Маральна-палітычная характарыстыка Мюнхенскіх пагадненняў, як «знака ганьбы» (М. Бамон), у французскай гістарыяграфіі адназначная [4].

Асаблівасцю *ўсходнегерманскай гістарыяграфіі* стаў той факт, што аналіз вытокаў і вынікаў Мюнхенскага пагаднення гісторыкамі ГДР у гэты перыяд цалкам адпавядаў савецкай канцэпцыі: здрадніцтва заходнееўрапейскіх дыпламатый сваім саюзным абавязкам, палітыка «замірэння» агрэсара і зрыў падпісання Усходняга пакта аб калектыўнай бяспецы перад пагрозай нямецкай агрэсіі [5, с. 68–69].

У канцы 1980-х гг. у *гістарыяграфіі ФРГ* адбыліся пэўныя змены. У 1988 г. да пяцідзесятай гадавіны Мюнхенскага пагаднення быў падрыхтаваны зборнік «Мюнхен 1938 год. Канец старой Еўропы». Аўтары зборніка прыйшлі да высновы, што дыскрымінацыя судэцкіх немцаў у Чэхаславакіі, мела месца і прэтэнзіі А. Гітлера былі тэарэтычна абгрунтаваныя [5, с. 66–67]. Пры гэтым ні адзін з аўтараў не спрабаваў апраўдаць нямецкую палітыку ў дачыненні да суседа (Чэхаславакіі).

Неабходна адзначыць, што асноўнай вартасцю прац *польскіх даследчы*каў, выдадзеных у канцы 1980-х – 2000-я гг., якія адлюстроўваюць канцэпцыю знешняй палітыкі «раўнавагі» паміж вялікімі суседзямі Германіяй і СССР ІІ Рэчы Паспалітай у перыяд Судэцкага крызісу 1938 г., з'яўляецца адсутнасць ідэалагічнай накіраванасці і імкненне даследчыкаў да гістарычнай аб'ектыўнасці. Большасць гісторыкаў лічыць, што Мюнхенскі дагавор 29–30 верасня 1938 г. стаў сімвалам палітыкі «*appeasetent*». Па іх меркаванні, «замірэнне» агрэсіўнай палітыкі Германіі было вынікам дзейнасці Нэвіля Чэмберлена, які прыступіў да абавязкаў прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі ў маі 1937 г. На думку польскіх гісторыкаў, асноўнай мэтай яго палітыкі было жаданне накіраваць экспансію нацыстаў на ўсход, у бок СССР. Брытанскія і французскія дыпламаты вырашылі, што рэгуляваць адносіны паміж Германіяй і Італіяй яны павінны без удзелу СССР і ЗША [6, s. 205].

Гісторыкі-міжнароднікі М. Корнат, С. Жэрка, А. Л. Сова негатыўна ацэнваюць вынікі дзейнасці міністра замежных спраў ІІ Рэчы Паспалітай Ю. Бэка, які, праводзячы палітыку «лавіравання» паміж Англіяй, Францыяй, Германіяй на захадзе, і СССР – на ўсходзе, здрадзіў нацыянальным інтарэсам Польшчы, падтрымліваючы «добрасуседскі нейтралітэт» у перыяд Судэцкага крызісу 1938 г. Польскі ўрад быў вельмі зацікаўлены ў далучэнні Цэшынскай вобласці ЧСР, населенай этнічнымі палякамі (67 тыс. чалавек), што паспяхова атрымалася пасля падпісання Мюнхенскай дамовы [7–9].

Дадзеная тэндэнцыя была відавочна адлюстравана гісторыкамі на міжнародных навуковых канферэнцыях, прысвечаных юбілею Мюнхенскага пагаднення 1938 г. і 50-годдзю пачатку Другой сусвенай вайны, арганізаваных навукоўцамі Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве.

Некаторыя гісторыкі разглядалі тэзы аб магчымасці прадухілення пачатку Другой сусветнай вайны, калі б ячшэ ў перыяд Мюнхенскага пагаднення вядучымі еўрапейскімі дэмакратыямі быў дадзены калектыўны адпор агрэсіўным дзеянням Германіі, а не пасіўнае «замірэнне» агрэсара і імкненне да вырашэння яго інтарэсаў за кошт малых суседніх дзяржаў [10, 11].

Значны ўнёсак у навуковае *польска-расійскае* супрацоўніцтва быў зроблены ў 2004 г., дзякуючы намаганням створанай Міжурадавай групы па складаных пытаннях, якія вынікаюць з гісторыі расійска-польскіх адносін, і Цэнтра польска-расійскага дыялога і пагаднення пад кіраўніцтвам вядомага польскага даследчыка доктара гісторыі Славаміра Дэмбскага. З расійскага боку саўдзельнікам з'яўляўся рэктар МДіМА, акадэмік РАН Таркуноў А. В. Вынікам працы дадзенай групы навукоўцаў з'явілася калектыўная манаграфія, прысвечаная асноўным падзеям міжнароднага крызісу 1938–1939 гг. [12, 13].

На мяжы стагоддзяў значны ўнёсак у распрацоўку вывучаемага пытання зрабілі чэшскія даследчыкі, дзякуючы праведзенай у Празе ў 2003 г. Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Мюнхенскае пагадненне – шлях да дэструкцыі дэмакратыі ў Еўропе» (Прага, 24–25 кастрычніка 2003 г.). Дамінуючы пункт гледжання, які прагучаў у прамовах удзельнікаў канферэнцыі, зводзіўся да наступнага: Мюнхенскае пагадненне з'явілася «вынікам палітыкі прымірэння, небяспечнай і беспаспяховай у любы час і ў любым асяроддзі, мэтанакіраваным прымірэнствам дэмакратыі з дыктатарам, які абвясціў вайну дэмакратыі» [14].

«Мюнхен» – гэта назва стала намінальным паняццем, яна сімвалізуе агрэсіўную сутнасць гітлераўскай знешняй палітыкі, злачыннае невыкананне міжнародных абавязацельстваў заходнімі дзяржавамі і несумяшчальнасць з асноўнымі прынцыпамі міжнароднага права. На думку замежных гісторыкаў, Мюнхенскае пагадненне вызначыла чарговы крок на шляху да развязвання Другой сусветнай вайны і першы крок да страты чэхаславацкай дзяржаўнасці, ліквідацыі сістэмы калектыўнай бяспекі і канчатковага ўхілення Лігі Нацый ад рашэння значных пытанняў еўрапейскай і сусветнай палітыкі, фактычную дэнансацыю савецка-чэхаславацкага дагавора аб узаемнай дапамозе ад 16 мая 1935 г. [14, s. 7].

Чэшскія гісторыкі, аналізуючы геапалітычнае становішча ЧСР у верасні 1938 г., акцэнтавалі ўвагу на такіх пытанняк: ці ішла тады гаворка аб «здрадзе» нацыянальных інтарэсаў урадам Э. Бэнеша; ці была Чэхаславакія дэмакратычнай дзяржавай, супольнасцю грамадзян, здольных да барацьбы за свабоду і самастойнасць, альбо з'яўлялася краінай, якая раздзіралася ўнутранымі супярэчнасцямі, новай «турмой народаў», і не заслугоўвала нічога, акрамя дэструкцыі; наколькі абгрунтаванай была арыентацыя знешняй палітыкі ЧСР выключна на падтрымку Францыі, краіны слабай, абяскроўленай Першай сусветнай вайной, і г. д. [14]. Па сутнасці, усе гэтыя пытанні з'яўляюцца актуальнымі і абмяркоўваюцца гісторыкамі і па сённяшні дзень.

**Заключэнне.** Такім чынам, магчыма канстатаваць наяўнасць супярэчлівых падыходаў гісторыкаў у трактоўцы Мюнхенскага пагаднення, яго вытокаў і наступстваў. Асноўнай вартасцю ўсіх навуковых даследаванняў, як замежных, так і расійскіх, з'яўляецца жаданне гісторыкаў паказаць з улікам назапашаных ведаў і новых архіўных крыніц, як свет падышоў да фатальнай рысы, назваць усіх вінаватых у развязванні глабальнага канфлікту ў верасні 1938 г. і тыя сілы, якія спрыялі эскалацыі агрэсіі.

У сучаснай *англійскай*, *французскай*, *нямецкай* і *польскай* гістарыяграфіі асноўны акцэнт у рэалізацыі палітыкі «замірэння агрэсара» робіцца на «лаяльнасці» еўрапейскіх дэмакратый да агрэсіўных дзеянняў Гітлера, а таксама палітычнай недальнабачнасці прэм'ерміністра Вялікабрытаніі Н. Чэмберлена ў перыяд Мюнхенскага крызісу. Між іншым, у замежнай гістарычнай навуцы зацвердзілася меркаванне аб непазбежнасці Мюнхенскага пагаднення з мэтай захавання міру ў перадваеннай Еўропе.

З нашага пункту гледжання, цікавым і карысным для сучасных гісторыкаў з'яўляецца магчымасць сістэмнага аналізу як замежных, так і расійскіх крыніц для пераасэнсавання існуючых канцэпцый «замірэння» агрэсара, здрадніцтва еўрапейскіх дыпламатый сваім саюзным абавязкам, ігнаравання міралюбівых прапаноў СССР і інш. з мэтай вывучэння ўрокаў і наступстваў перадваенных падзей у развязванні глабальнай эскалацыі агрэсіі для вырашэння актуальных праблем развіцця сусветнага грамадства.

**Літаратура**

1. Политическая наука: словарь-справочник / авт. и сост. И. И. Санжаревский. Изд. 6-е, испр. и доп. Тамбов: ТГТУ, 2015. 368 с.

2. Документы и материалы кануна Второй мировой войны. 1937–1939. В 2 т. Т. 1. Ноябрь 1937 г. – дек. 1938 г. / М-во иностр. дел СССР; редкол.: И. Н. Земсков [и др.]. М.: Политиздат, 1981. 376 с.

3. Кто помогал Гитлеру в развязывании Второй мировой войны // Сегодня.ru. Информационно-аналитическое сетевое издание. 11.10.2011. Москва, 2011. URL: http://www.segodnia.ru/content/11746 (дата обращения: 20.09.2017).

4. Рубцова Е. В., Лендич В. В., Прокопова Е. А. Мюнхенское соглашение 1938 года и его последствия // Научно-методический электронный журнал «Концепт». 2016. Т. 11. С. 161–165. URL: http://e-koncept.ru/2016/86036.htm (дата обращения: 20.09.2017).

5. Куренков В. Ю. Мюнхенское соглашение 1938 г. в работах российских и германских исследователей: Краткий историографический обзор // Вестник Дагестанского научного центра. 2013. № 48. С. 65–70.

6. Kamiński M. K., Zacharias M. J. W cieniu zagroženiá. Polityka zagraniczna RP 1918–1939. Warszawa: Wyd. Głos, 1993. 238 s.

7. Kornat M. Józef Beck i polityka «równowagi» międzywojennej polski jako mit. Uwagi nad historiografią problemu // Zeszyty naukowe Uniwersytetu Jagiellońskiego. Prace Historyczne, Studia Polono-Danubiana et Balcanica. Kraków, 1997. Z. 124. S. 213–224.

8. Żerko S. Polska wobec zbliżenia niemiecko-radzieckiego u schylku łat trzydziestych // Przegląd Zachodni. 1998. Z. 2. S. 115–135.

9. Sowa A. L. U progu wojny (z dziejów spraw wewnętrznych i polityki zagranicznej II Rzeczypospolitej. Kraków: WUJ, 1997. 246 s.

10. Rok 1938: Aneksja Austrii i Monachium // Materiały Międzynarodowej sesji naukowej, 7–8 grudnia 1983 r. / pod red. Henryka Batowskiego. Zeszyty Naukowe Uniwersitetu Jagiellońskiego. Prace Historyczne, Studia Polono-Danubiana et Balcanica II. Kraków: WUJ, 1987. Z. 83. 126 s.

11. Polska, Niemcy, Europa w 1939 r. // Materiały sesji zorganizowanej w Uniwersytecie Jagiellońskim 14 grudnia 1989 r w okazji 50 rocznicy wybuchu II wojny światowej / pod red. Michała Pułaskiego., Uniw. Jagiel., Praca Historiczna. Kraków: WUJ, 1991. Z. 99. 168 s.

12. Kryzys 1939 roku w interpretacjach polskich i rosyjskich historykow / pod red. Sławomira Dębskiego i Michaiła Narińskiego; Polski Institut Spraw Międzynarodowych. Warszawa: PISM, 2009. 479 s.

13. Кризис 1939 года в интерпретациях польских и российских историков / под ред. Славомира Дембского и Михаила Наринского. Варшава: Польский институт международных дел, 2009. 479 с.

14. Mnichovská dohoda. Cesta k destrukci demokracie v Evropě. Praha: WPU, 2004. 272 s.

## References

1. *Politicheskaya nauka: slovar'-spravochnik* [Political science: dictionary-reference book]. Author and comp. I. I. Sansharevski. Tambov, TGTU Publ., 2015. 368 p.

2. *Dokumenty i materialy kanuna Vtoroy mirovoy voyny. 1937–1939. V 2 t. T. 1. Noyabr' 1937 – dekabr' 1938 g.* [Documents and materials before the Second world war. 1937–1939. In 2 vol. Vol. 1. November 1937 – December 1938]. Moscow, Politizdat Publ., 1981. 376 p.

3. Who helped Hitler in the outbreak of the Second World War. *Segodnya.ru. Informatsionno-analiticheskoye setevoye izdanie* [Segodnya.ru. Information analytical network edition]. 11.10.2011. Moscow, 2011 (In Russian). Available at: http://www.segodnia.ru/content/11746 (accessed 20.09.2017).

4. Rubtsova E. V., Lendich V. V., Prokopova Ye. A. Munich agreement of 1938 and its implications. *Nauchno-metodicheskiy elektronnyy zhurnal "Kontsept"* [Scientific-methodical electronic journal "Concept"], 2016, vol. 11, pp. 161–165 (In Russian). Available at: http://www.e-koncept.ru/2016/86036.htm (accessed 20.09.2017).

5. Kurenkov V. Yu. The Munich agreement of 1938, in the works of Russian and German researchers: the brief historiographical review. *Vestnik Dagestanskogo nauchnogo centra* [Bulletin of the Dagestan scientific center], 2013, no 48, pp. 65–70 (In Russian).

6. Kamiński M. K., Zacharias M. J. W cieniu zagroženiá. Polityka zagraniczna RP 1918–1939. Warszawa, Wyd. Głos, 1993. 238 s.

7. Kornat M. Józef Beck i polityka "równowagi" międzywojennej polski jako mit. Uwagi nad historiografią problem. Zeszyty naukowe Uniwersytetu Jagiellońskiego. Prace Historyczne, Studia Polono-Danubiana et Balcanica. Kraków, 1997, z. 124, ss. 213–224.

8. Żerko S. Polska wobec zbliżenia niemiecko-radzieckiego u schylku łat trzydziestych. Przegląd Zachodni, 1998, z. 2, ss. 115–135.

9. Sowa A. L. U progu wojny (z dziejów spraw wewnętrznych i polityki zagranicznej II Rzeczypospolitej. Kraków, WUJ, 1997. 246 s.

10. Rok 1938: Aneksja Austrii i Monachium. Materiały Międzynarodowej sesji naukowej, 7–8 grudnia 1983 r. Pod red. Henryka Batowskiego. Zeszyty Naukowe Uniwersitetu Jagiellońskiego. Prace Historyczne, Studia Polono-Danubiana et Balcanica II. Kraków, WUJ, 1987, z. 83. 126 s.

11. Polska, Niemcy, Europa w 1939 r. Materiały sesji zorganizowanej w Uniwersytecie Jagiellońskim 14 grudnia 1989 r w okazji 50 rocznicy wybuchu II wojny światowej. Pod red. Michała Pułaskiego, Univ. Jagiel., Praca Historiczna. Kraków, WUJ, 1991, z. 99. 168 p.

12. Kryzys 1939 roku w interpretacjach polskich i rosyjskich historykow. Pod redakcja Sławomira Dębskiego i Michaiła Narińskiego. Polski Institut Spraw Międzynarodowych. Warszawa, PISM, 2009. 479 s.

13. *Krizis 1939 goda v inerpretatsiach pol'skih i rossijskih istorikov* [The crisis of 1939 in the interpretations of Polish and Russian historians]. Ed. by Sl. Dembski and M. Narinski. Warshawa, Pol'skiy institut Mezhdunarodnykh del Publ., 2009. 479 p.

14. Mnichovská dohoda. Cesta k destrukci demokracie v Evropě. Praha, WPU, 2004. 272 s.

## Інфармацыя пра аўтара

**Дрожжа Людміла Чэславаўна** – магістр гісторыі, майстар кафедры прамысловай экалогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: l_drojja@tut.by.

## Information about the author

**Drojja Liudmila Cheslavovna** – Master of History, master, the Department of Industrial Ecology. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: l_drojja@tut.by.

*Паступіў 14.03.2018*